# АЛЯКСАНДР ХАМІНСКІ

**1859-1936**



**Журналіст, дэпутат, грамадскі дзеяч, драматург, уладальнік шматгаліновай гаспадаркі.**

Гэта ўсё не розныя людзі, а адзін - Аляксандр-Станіслаў-Лаўрэнцій Станислававіч Хамінскі, прадстаўнік славутага старажытнага шляхецкага роду з краю Блакітных азёр.

Ён нарадзіўся ў Коўна ў 1859 годзе і быў апошнім дзіцём генерал-лейценанта Станіслава Хамінскага і Эвеліны са Шчытоў. На жаль, на данны момант не знойдзена пісьмовых крыніц аб абрадзе хрышчэння хлопчыка, але яго хросным, па некаторым здагадкам, мог быць імператар Расійскай імперыі Аляксандр ІІ. Прадстаўнікі царскай сям'і часам выступалі ў ролі хросных ў дваранскіх сем'ях. А калі ўлічыць той факт, што бацька Аляксандра, Станіслаў, яшчэ з юнацтва быў у добрых стасунках з імператарам і ўваходзіў у яго світу, то гэтыя здагадкі могуць быць рэчаіснасцю.

Школьныя гады Аляксандра прайшлі ў Валагодскай гімназіі, а вось вышэйшую адукацыю ён атрымаў ў Варшаўскім універсітэце на юрыдычным факультэце.

Пад час навучання ў Варшаве Аляксандр пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Ядвігай-Елізаветай-Юзефай Горват (1863-1930), з якой і ажаніўся ў 1885 годзе. Гісторыю жыцця іх дзяцей можна прачытаць ў асобным артыкуле "Праклён Хамінскіх". Ядвіга мела клопаты са здароўем, а стан бацькі, які гаспадарыў у Альшэва, усе больш пагаршаўся, і гэтыя жыццёвыя абставіны прымусілі Аляксандра пераехаць у Альшэва ў 1886 годзе.

Пасля смерці бацькі ў 1886 годзе Аляксандр Хамінскі становіцца паўнапраўным уладальнікам маёнтка Альшэва і распачынае яго мадэрнізацыю. Нягледзячы на гуманітарную адукацыю, Аляксандр хутка ўліваецца ў кіраванне гаспадаркай і набывае славу скрупулёзнага, практычнага, прагрэсіўнага гаспадара. Альшэва становіцца

паспяховай шматгаліновай гаспадаркай, дзе акрамя скотаводцтва і конегадоўлі, таксама займаюцца садавінай, агародніцтвам, а яшчэ і традыцыйным пчалярствам (бортніцтвам).

Практычнаць і аналітычны склад розуму гаспадара – усе гэта дазволіла Альшэва стаць адной з самых паспяховых гаспадарак тых мясцін. Заслугі Аляксандра Хамінскага на гэтым попрышчы былі адназначаны тым, што ў 1903 годзе ён уваходзіць у састаў Віленскга таварыства сельскай гаспадаркі, дзе ўзначальвае камітэт вінакурства. Аляксандр Хамінскі займаўся не толькі адной гаспадаркай.


OLSZEW
ALEKSANDRA CHOMIŃSKIEGO
poczta i telegraf ŁYNTUPY
(gub. Wileńskiej)
Stacja ŁYNTUPY
kolei podjazdowej Święciańskiej

10/23 III. 1915.

JW Hrabia Michał-Stanisław Kossakowski w Nidokach.

Szanowny Panie Hrabio,
Proszę przyjąć moje podziękowanie za tak szybką odpowiedź. Wiadomość o wydaniu subsydyum P. Z. Zaleskiej zakomunikowałem. W zasadzie zgadzam się z wyrażonemi przez Pana poglądami.
Łączę najuprzejmiejsze ukłony i wyrazy wysokiego szacunku i poważania
A. Chomiński

ZAŁATWIONO

**Пісьмо да графа М. Касакоўскага**
**1915 год**

На час яго жыцця выпалі значныя міравыя падзеі пачатку XX стагодзя і на палітычнай ніве ён таксама меў поспех. У 1907 годзе пад час выбараў у I дзяржаўную думу ён быў кіраўніком Віленскай выбарчай акругі і сам абіраўся як дэпутатам, так і паслом у дзяржаўную раду ад Віленскай губерні (1910 г.). З'яўляўся старшынёй Войстамска-Свірскага камітэта таварыства «Чырвоны крыж». У 1913 годзе злажыў з сябе паўнамоцтвы пасла з-за таго, што быў прыхільнікам муніцыпальнага кіравання і праекта стварэння зямельнага фонду за кошт казённых, царкоўных і часткова памешчыцкіх зямель. Выступаў за надзяленне сялян зямлёй праз сялянскі банк, якім бы кіравалі мясцовыя ўлады. Першая суветная вайна застала Аляксандра Хамінскага ў Вільні, але ён вялікімі намаганнямі вярнуўся ў Альшэва, якое знаходзілася як раз у франтавой зоне і як мог бараніў гаспадарку ад наступстваў вайы. У наступныя гады ён таксама прымаў актыўны ўдзел ў палітычным і грамадзянскім жыцці свайго роднага краю пад час пастаянных палітычных змен.

Аляксандр меў цікаўнасць не толькі да гаспадаркі і палітычнага жыцця, але і да грамадзянскай дзейнасці. У 1896 годзе разам з Віктарам Старжынскім (уладальнікам маёнтка Камарова) фундуе сродкі на дабудаўніцтва каменнага касцёла ў вёсцы Канстанцінава.



**Канстанцінаўскі касцёл**

Працягвае сямейную традыцыю барацьбы з малапісьменнасцю і прымае актыўны ўдзел у адукацыі мясцовага насельніцтва. За свае сродкі Аляксандр пабудаваў у 1906 годзе спецыялізаваны школьны будынак з бясплатным навучаннем. Хаця заняткі павінны былі адбывацца на расійскай мове, вучні асвойвалі праграму ў тым ліку і на польскай. Пры гэтым на ўсіх экзаменах вучні гэтай школы былі ў ліку першых сярод

іншых школ. Навучанне да 1926 года вялося ў тым ліку і на беларускай мове.



A. CHOMIŃSKI.

MILJON

Szkic sceniczny.

*Wygrywającym w „Miljonówkę"*
*Autor.*

TŁOCZNIA „LUX", WILNO, PO-GUBERNATORSKA 1. — 1920.

**Выдавецтва “LUX” Людвіка Хамінскага**

Карціну разнапланавага жыцця Аляксандра Хамінскага дапаўняе той факт, што яшчэ ён быў драматургам і журналістам, з пад пяра якога ў 1882 годзе выйшлі: раман “Апошняе пісьмо”, аповесць “Два вянцы”.

У больш сталым узросце ён напісаў драмы “Міль’ён” (1921), “Ксёндз Адам” (1926), “Ён і яна”. Як журналіст публікаваў шмат палітычных і грамадскіх артыкулаў у газетах і журналах “Край”, “Слова”, “Літоўскі кур'ер”. Намаганнямі Аляксандра Хамінскага былі апублікаваны фрагменты з дзённіка яго дзядулі па матчынай лініі Юзэфа Шчыта, а ў «Літаратурным квартальніку» за 1911 год былі надрукаваны ўспаміны яго бацькі генерала Станіслава Хамінскага.

Самай значнай падзеяй па захаванні спадчыны была публікацыя разам з прафесарам Пташыцкім у 1907 годзе першага пераклада на польскую мову знакамітага помніка літаратурнай культуры “Альшэўскага летапіса”, які датуецца 1550 годам і быў напісаны на старажытна беларускай мове. Але на жаль амаль увесь наклад 1907 года быў знішчаны пад час рабавання бібліятэкі і сядзібы ў 1920 годзе, таму было запланавана новае выданне ў 1928 годзе, аб чым Аляксандр Хамінскі паведаміў у сваім інтэрв'ю для газеты “Ерока” у 1927 годзе. Самыя цэнныя экзэмпляры з сямейнай бібліятэцы, у тым ліку і летапіс, захаваліся ў вірах ліхалецця, бо былі датэрмінова вывезены і схаваны ў банкаўскую ячэйку ў Вільні.

Калі на грамадзянскім попрышчы ў Аляксандра Хамінскага ўсе складалася вельмі добра, то ў сямейным жыцці ў яго было шмат жалю. З жонкай Ядвігай яны мелі 6 дзяцей, 5 з каторых памерлі ў дзяцінстве і былі пахаваны на сямейных могілках у Канстанцінава. Толькі адзін з іх, Людвік, выжыў і стаў апошнім уладальнікам сядзібы ў Альшэва.

Пасля смерці ў 1930 годзе жонкі Ядвігі Аляксандр пражыў яшчэ 6 гадоў, працягваючы актыўна цікавіцца гаспадарчымі і грамадзянскімі справамі.

У 1936 годзе Аляксандр Хамінскі памер ва ўзросце 77 год. Па некаторым звесткам, першапачаткова быў пахаваны ў Канстанцінава, але на сённяшні час апошнім месцам яго супакою, а таксама яго жонкі Ядвігі, лічацца могілкі “Powązki” у Варшаве, дзе яны пахаваны побач са сваім сынам Людвікам.